ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ

“АЛЯХНОВІЦКІ ДЗІЦЯЧЫ САД МАЛАДЗЕЧАНСКАГА РАЁНА”

# ПАШПАРТ МІНІ-МУЗЕЯ “БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА”





**НАЗВА МІНІ-МУЗЕЯ:** “Беларуская хатка”

**ДАТА АДКРЫЦЦЯ:** 2008 год

**ПРОФІЛЬ МІНІ-МУЗЕЯ:** этнаграфічны.

**МЭТА СТВАРЭННЯ МІНІ-МУЗЕЯ “БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА”**–далучэннедзяцейдашкольнагаўзросту да вытокаўнацыянальнай культуры і народных традыцый.

**ЗАДАЧЫ:**

- фарміравацьэтнамастацкую культуру;
- адраджаць і захоўвацьэтнаграфічнуюспадчыну як часткунацыянальнай культуры;
- даць веды пра культуру свайгоэтнасу, як падмурка для захаваннянацыянальнайсамасвядомасці, садзейнічацьвыхаваннютворчай, актыўнайасобы;
- развівацьмаральна-этычныякасці, талерантнасць, вобразнаемысленне, памяць, творчыяздольнасці,фантазіюсродкамідэкаратыўна-прыкладногамастацтва;
- выхоўвацьпатрыятычныяпачуцці, пачуццёлюбові да роднага краю і гонару за яго, паважліваестаўленне да беларускаймовы і традыцыйнародаў.



Міні-музей “Беларуская хатка” займае асобнае памяшканне на другім паверсе ўстановы адукацыі побач са спартыўнай залай і ўяўляе сабой адлюстраванне жылога вясковага памяшкання, дзе сабраны сапраўдныя прадметы побыту і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Плошча памяшкання – 36.4 м2.

Усе экспанаты сабраны сумеснымі намаганнямі педагогаў установы і бацькоў. У міні-музеі "Беларуская хатка" прадстаўленыпрадметыпобытубеларусаў XIX, першайпаловы XX стст. і прадметыматэрыяльнай культуры беларускага народа, а таксамапрадметыдэкаратыўна-прыкладнойтворчасці. Экспанаты музея маюцьшматгадовуюгісторыю і знаёмяцьвыхаванцаўсастановішчамбеларускай хаты, з прадметаміпобыту. Вельміхацелася, кабдзецідакрануліся да прадметаўпобытунашыхдзядуляў і бабуль, адчуліiхцяпло, душу, якойянысагравалі свой дом.



## МУЗЕЙНЫ ФОНД МІНІ-МУЗЕЯ ЎКЛЮЧАЕ Ў СЯБЕ:

- ***Асноўны фонд:*** самавары, калаўрот, рушнікі, ступа, кошык, гаршок, серп, дыван, печ, прасы, маслобойка, гарлач, збан, лялькі, рубель, калыска, краваць, адзенне, лапці, гадзіннік, газавая лямпа, ваўначоска, матавіла,чапяла, качарга, пранік, таўкач, гляк, крэсла, гліняны посуд, драўляныя прадметы побыту, пшанічны, ячменны, ржаны снапы і інш;

- ***Фонд дапаможных матэрыялаў:*** папка для педагогаў з распрацоўкамі заняткаў, мерапрыемстваў;

- ***Фонд сыравінных матэрыялаў:*** вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з саломкі, гліны, льну і інш.

Міні - музей "Беларуская хатка" пастаянна папаўняецца і абнаўляецца.



# СІСТЭМА РАБОТЫ МІНІ-МУЗЕЯ
# “БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА”

Экспанаты міні - музея выкарыстоўваюцца для азнаямлення выхаванцаў са звычаямі і традыцыямі беларускага народа, на занятках па выяўленчаму мастацтву, пры правядзенні святаў "Масленіца", "Купалле", "Запрашаем на Калядкі", "Свята восені" і іншыя. У традыцыю ўваходзіць правядзенне ў музеі тэматычных гутарак “Народнае адзенне”, “Рамёслы”, “Традыцыйныя віды працоўнай дзейнасці беларусаў”, “Традыцыі і звычаі беларускага народа”, выстава малюнкаў “Узор на беларускім касцюме”.

З мэтай выхавання пачуцця прыналежнасці да беларускай нацыі, педагогамі распрацаваны цыкл заняткаў, зместам якога сталі старадаўнія беларускія традыцыі і звычаі, узаемадзеянне чалавека з прыродай, адлюстраванне жыцця беларусаў у працы і побыт. Былі распрацаваны канспекты экскурсій у міні - музей. Экскурсіі праводзяць не толькі педагогі, але і самі выхаванцы старэйшага ўзросту.



Вялікую ролю ў фарміраванні ў дзяцей цікавасці да культуры і традыцый беларускага народа адыгрывае супрацоўніцтва з бацькамі. Яны разумеюць неабходнасць ведання дзецьмі беларускай мовы, аказваюць дапамогу ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы. Бацькі актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах дашкольнай установы, дзе ўжо добрай традыцыяй стала правядзенне пазнавальна-выхаваўчых гульняў, народных святаў.

Дзякуючы сабранаму матэрыялу, які маецца ў міні – музеі, можна данесці да выхаванца часцінку тых ведаў аб родным краі, аб гісторыі беларускага народа, аб дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, абрадах і традыцыях, якія існуюць у нашай краіне з пакон вякоў.



# ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН У МІНІ-МУЗЕЕ



ПАГУЛЯЙ!



ПАПРАСІ ДАРОСЛАГА
ПРАЧЫТАЦЬ ІЛІ РАСТЛУМАЧЫЦЬ!



НЕЛЬГА ТРОГАЦЬ!



МОЖНА ПАНЮХАЦЬ!



ГЭТЫЯ ЭКСПАНАТЫ
МОЖНА ПАМАЦАЦЬ!



ГЭТЫЯ ЭКСПАНАТЫ
МОЖНА ПАГЛЯДЗЕЦЬ!



# ФОТАГАЛЕРЭЯ






РУБЕЛЬ
ТАЎКАЧ
Пранік
ПРАНІК


ПРАС




МАСЛАБОЙКА




Гадзіннік




ЛАПЦІ




Ступа

